Спіс цытаваных крыніц

1. *Аляшкевіч, М.* Улюблёная гульня. Беларускі мадэрн. Ці ёсць ён сёння? [Электронны рэсурс] / М. Аляшкевіч // Дзеяслоў. — 2011. — № 1. — Рэжым доступу: http://dziejaslou.by/inter/dzeja/dzeja.nsf/htmlpage/al50?OpenDocument. — Дата доступу: 23.10.2013. — Загал. з экрана.
2. *Лявонава, Е. А.* Плыні і постаці: з гісторыі сусветнай літаратуры другой паловы XIX—XX стст. / Е. А. Лявонава. — Мн. : Крыніца, 1998. — 336 с.
3. *Барт, Р.* Семиология как приключение. «Писать» — непереходный глагол? / Р. Барт // Arbor Mundi (Мировое дерево). — 1993. — Вып. 2. — С. 81—82.
4. Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. — Мн. : Беларусь, 2011. — С. 607.
5. *Баршчэўскі, Я.* Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях / Я. Баршчэўскі. — Мн. : Маст. літ., 1990. — 383 с.
6. *Сыракомля, У.* Выбраныя творы / У. Сыракомля. — Мн. : Маст. літ, 2011. — 584 с.
7. *Казько, В.* Хроніка дзетдомаўскага саду / В. Казько. — Мн. : Маст. літ, 1987. — 430 с.

Материал поступил в редакцию 25.10.2013 г.

УДК 81’373.47(476)

А. М. Худніцкая
Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка», Мінск

ДЗЕЯСЛОВЫ З КАНАТАЦЫЙНЫМ ЗНАЧЭННЕМ: ХАРАКТАРЫСТЫКА БАЗАВЫХ ПАНЯЦЦЯЎ

Эмацыянальная сфера, што ахоплівае ўласна эмоцыі, афекты, інтарэсы, жаданні, імкненні, прыхільнасці, а таксама карэнным чынам уплывае на ацэначныя меркаванні, з’яўляецца «асноўнай матывацыйнай сістэмай чалавека» [1, с. 32]. Інакш кажучы, эмоцыі складаюць падмурак усёй дзейнасці людзей, выступаючы ў якасці яе асноўных пабуджальнікаў і матываў, а таксама ў якасці крытэрыяў пры суб’ектыўнай ацэнцы фактаў, падзей або з’яў рэчаіснасці.

Для абазначэння паняццяў, звязаных з эмацыянальнай сферай чалавека, у лінгвістычнай літаратуры выкарыстоўваюцца такія тэрміны, як «экспрэсія», «экспрэсіўнасць», якія ў сваім шырокім значэнні ўключаюць у сябе больш прыватныя паняцці «эмацыйнасць» («эматыўнасць»), «ацэначнасць» і «экспрэсіўнасць» (у вузкім значэнні). У вузкім значэнні тэрмін «экспрэсіўнасць» выкарыстоўваецца для абазначэння рэалізацыі колькасных ці колькасна-якасных характарыстык названай словам з’явы з дапамогай адной з трох семантычных прыкмет: а) занадта моцны/слабы па ступені свайго выяўлення; б) занадта вялікі/малы па велічыні, памеры; в) занадта вялікі/малы па колькасці [1, с. 32]. Прасцей кажучы, дзеясловы з такім значэннем абазначаюць вельмі высокую або вельмі нізкую ступень выяўлення з’явы, дзеяння, стану, напрыклад: *рагатаць* ‘вельмі моцна, нястрымна смяяцца’, *палаць* ‘вельмі моцна гарэць’, *жарнуцца* ‘моцна ўдарыцца, стукнуцца’.

Сярод розных тыпаў лексічных значэнняў выдзяляюцца словы з намінатыўным, прадметна-лагічным (дэнатацыйным) і канатацыйным значэннем. Канатацыя ў дзеясловах фарміруецца за кошт розных дадатковых сэнсавых, эмацыянальных, стылістычных адценняў да асноўнага лексічнага значэння і служыць ацэнкай розных прадметаў і з’яў рэчаіснасці.

Канатацыя — гэта дадатковыя семантычныя або стылістычныя адценні, якія накладваюцца на асноўнае значэнне і надаюць эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку слову [2, с. 68]. Бясспрэчным ў мовазнаўстве з’яўляецца статус канатацыі як недэнатацыйнага кампанента значэння, неасноўнай, другаснай інфармацыі ў дачыненні да лагічна-прадметнага значэння слова. Улічваючы тое, што канатацыя — з’ява поліструктурная і ўключае ў сябе больш прыватныя паняцці (эмацыянальнасць/эматыўнасць, ацэначнасць, экспрэсіўнасць), бачыцца мэтазгодным выкарыстанне тэрмінаў «анататыў», «канататыўная лексіка», «лексіка з канататыўным значэннем».

Паводле І. У. Арнольд, у склад канатацыі ўваходзяць эматыўны (выражэнне словам эмоцыі або пачуцця), ацэначны (адабральная або неадабральная ацэнка, якая змяшчаецца ў значэнні слова), экспрэсіўны (выражэнне словам узмацнення прымет, якія ўваходзяць у дэнатацыйны кампанент значэння) і стылістычны (функцыянальны) кампаненты значэння: «усе чатыры кампаненты канатацыі могуць выступаць разам ці ў розных камбінацыях або ўвогуле адсутнічаць» [3, с. 108].

Мы падзяляем меркаванне тых даследчыкаў, якія лічаць, што канатацыя — гэта недэнатацыйны кампанент значэння, які суправаджае лагічна-прадметны змест і пэўным чынам яго ўдакладняе. У склад канатацыі, у адпаведнасці з меркаваннем большасці лінгвістаў, уключаюцца эматыўны, экспрэсіўны, ацэначны кампаненты значэння.

«Ацэначны кампанент канатацыі, — піша В. Д. Старычонак, — выражае ацэнку (станоўчую ці адмоўную, пахвальную ці непахвальную) прадметаў і з’яў рэальнага свету. У адрозненне ад эмацыянальнасці, якая характэрна як гаворачай, так і слухаючай асобе, ацэначнасць уласціва толькі гаворачай асобе. Ацэначнасць звычайна выступае ў трох разнавіднасцях — нейтральнай, станоўчай (меліяратыўнай) і адмоўнай (дэрагатыўнай, пеяратыўнай)» [2, с. 118].

На думку В. К. Харчанка, ацэначнасць уяўляе сабой «закладзеныя ў дзеясловах дадатныя ці адмоўныя адносіны да чаго-небудзь» [4, с. 94].

Л. А. Кісялёва адзначае, што «эмацыянальная ацэнка (ацэначнасць) звязана не толькі з псіхікай (гэта характэрна для эмацыянальнасці), але і з мысленнем» [5, с. 385].

В. С. Ахманава гаворыць, што ацэнка ёсць не што іншае, як «суджэнне гаворачага, яго адносіны — адабрэнне ці неадабрэнне, жаданне, заахвочванне і г. д. — як адна з асноўных частак стылістычнай канатацыі» [6, с. 305].

Такім чынам, ацэнка можа мець не толькі псіхалагічную (пачуццёвую), але і лагічную аснову ці сумяшчаць у сабе і тое і другое. Зыходзячы з гэтага, ацэнка можа быць суб'ектыўнай, суб'ектыўна-аб'ектыўнай, аб'ектыўнай, эмацыянальнай, экспрэсіўнай, дадатнай і адмоўнай, агульнай і маўленчай.

Неабходна адзначыць, што ацэнка і ацэначнасць не з'яўляюцца рэлевантнымі паняццямі. Ацэнка, як адзначалася раней, — гэта тое дадатковае сэнсавае адценне (эмацыянальнае ці лагічнае) да асноўнага лексічнага значэння, а ацэначнасць — рэальная ці патэнцыяльная магчымасць слова выражаць тую ці іншую ацэнку.

Экспрэсіўнасць як адзін з кампанентаў канатацыі «з'яўляецца адной з найярчэйшых асаблівасцей ужывання дзеясловаў. Найбольш спецыфічнымі яе кампанентамі з'яўляюцца вобразнасць, інтэнсіўнасць і экстэнсіўнасць» [2, с. 39].

Вобразнасць — абагульненае пачуццёва-нагляднае ўяўленне аб прадметах (з'явах) аб'ектыўнай рэчаіснасці. Вобразнасць таксама звязана з захаваннем у слове матываванасці, яркай унутранай формы і яе накіраванасці на якасна-колькасную характарыстыку.

Інтэнсіўнасць (узмацняльнасць) служыць для адлюстравання градацыі ў ступені праяўлення пэўнай прыкметы, якасці. Пры экстэнсіўнасці на пярэдні план выходзяць не якасныя, а колькасныя паказчыкі [7, с. 37].

Экспрэсіўнасць звычайна разумеецца як сінонім выразнасці слова, якая дасягаецца за кошт ацэначнасці лексемы, яе функцыянальных асаблівасцей. Аднак мы лічым, што нельга ставіць знак роўнасці паміж экспрэсіўнасцю і ацэначнасцю, паколькі не ўсе экспрэсіўныя дзеясловы з'яўляюцца ацэначнымі. Таму любы эмацыянальны дзеяслоў заўсёды будзе экспрэсіўным. Прычына тут хаваецца ў самой прыродзе экспрэсіі: ці з'яўляецца яна эмацыянальнай, інтэлектуальнай або стылістычнай. Значыць, ацэнка, эмацыянальнасць і экспрэсіўнасць звязаны паміж сабой, блізкія нейкімі гранямі, але і адрозніваюцца паміж сабою.

Эмацыянальнасць — гэта здольнасць слова выражаць пэўныя пачуцці, даваць эмацыянальную ацэнку, звязаную з аб'ектыўным успрыняццем прадметаў і з'яў навакольнага асяроддзя.

Разнастайныя эмацыянальныя рэсурсы маюць свой мэтанакіраваны характар: яны служаць пэўным крытэрыем ацэнкі прадметаў і з'яў, крыніцай эфектыўнага ўздзеяння на іншых людзей, сродкам самасцвярджэння ў аб'ектыўнай рэчаіснасці.

Такім чынам, пры ўсёй разнастайнасці падыходаў да вывучэння эмацыянальна-экспрэсіўна-ацэначнай лексікі і вызначэння базавых найменняў у лінгвістычнай літаратуры у цэлым назіраецца даволі дакладнае акрэсленне такіх паняццяў, як «экспрэсіўнасць», «эмацыянальнасць», «вобразнасць», «ацэначнасць», «ацэнка», «інтэнсіўнасць». На нашу думку, толькі дастаткова поўны аналіз асноўных паняццяў і сістэмнае апісанне канатацыі ва ўсіх яе аспектах дапаможа стварыць цэласную тэорыю канатацыі.

Спіс цытаваных крыніц

1. *Маліцкі, Ю. В.* Эмацыянальна-ацэначныя і экспрэсіўныя дзеясловы / Ю. В. Маліцкі // Роднае слова. — 2005. — № 4. — С. 32—34.
2. *Старычонак, В. Д.* Беларуская мова ад А да Я / В. Д. Старычонак. — Мн. : Выш. шк., 2000. — 367 с.
3. *Арнольд, И. В.* Стилистика. Современный английский язык / И. В. Арнольд. — Минск : Флинта ; Наука, 2002. — 384 с.
4. *Харченко, В. К.* Функциональная обусловленность синтагматики слов в производных значениях / В. К. Харченко // Рус. яз. в шк. — 1978.— № 5. — С. 91—95.
5. *Киселёва, Л. А.* Некоторые проблемы изучения эмоционально-оценочной лексики современного русского языка / Л. А. Киселёва // Проблемы русского языкознания : Учён. зап. Ленинград. гос. пед. ин-та им. А. И. Герцена. — Л. : [б. и.], 1968. — Т. 281. — 414 с.
6. *Ахманова, О. С.* Словарь лингвистических терминов / О. С. Ахманова. — М. : Просвещение, 1969. — 571 с.
7. *Лобань, Н. П.* Лексіка з канатацыйным значэннем у мастацкім кантэксце: тэматычныя і лексіка-семантычныя групы слоў / Н. П. Лобань // Роднае слова. — 2009. — № 3. — С. 36—38.

Материал поступил в редакцию 25.10.2013 г.

УДК 81'373:811. 161. 3

В. М. Шавель
Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы

СУТНАСЦЬ СТЫЛІСТЫЧНАЙ ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫІ ЛЕКСІКІ

Праблема стылістычнай дыферэнцыяцыі лексікі звязана з пытаннямі моўнай нормы. Канстатаваць стылістычную нейтральнасць ці стылістычную афарбаванасць пэўнай адзінкі — значыць устанавіць для яе моўную стылістычную норму. Аднак унармаванне ў галіне стылістычных рэсурсаў мовы часта ўскладнена неабходнасцю высвятлення, ці змяшчае ў сабе той або іншы элемент мовы стылістычную інфармацыю, а калі змяшчае, то менавіта якую.